УДК 821.161.3-4

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГІСТОРЫІ ПРАЗ ВОБРАЗЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ГЕРОЯЎ У ГІСТОРЫКА-БІЯГРАФІЧНЫХ ЭСЭ І. САВЕРЧАНКІ

**Бажок Ірына Аляксандраўна**
асістэнт кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны"
(г. Гомель, Беларусь)

*Ключавыя словы: эсэ, герой, аўтар, суб'ектыўнасць, гісторыя, я-канцэпцыя.*

*У артыкуле разглядаюцца гісторыка-біяграфічныя эсэ І. Саверчанкі. Сцвярджаецца традыцыйнасць звароту пісьменніка да рэпрэзентацыі гісторыі праз вобразы нацыянальных дзеячаў. Выяўляюцца асаблівасці гісторыка-біяграфічных эсэ ў параўнанні з мастацкай эсэістыкай.*

Эсэ І. Саверчанкі з кнігі "Бляск кароны" (2014 г.) з'яўляюцца прыкладамі гісторыка-біяграфічных эсэ. Традыцыя асэнсавання дзейнасці гістарычна значных асоб у літаратуры была закладзена прыкладна ў І стагоддзі. Старажытнагрэчаскі пісьменнік Плутарх склаў "Параўнальныя жыццепісанні", прысвечаныя значным грамадскім і палітычным дзеячам Грэцыі і Рыма. Плутарх не імкнуўся даць поўную біяграфію сваіх герояў. У яго тво-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рах – веліч чалавека, яго характар і думкі. Плутарх апісаў біяграфіі не ўсіх вядомых на той час дзеячаў. Героямі яго твораў сталі "выбраныя" асобы, якіх сам аўтар лічыў сапраўднымі патрыётамі і годнымі людзьмі.

Героі гісторыка-біяграфічных эсэ І. Саверчанкі – асобы шматгранныя, якія праявілі сябе ў розных сферах грамадска-палітычнага жыцця. Акрамя таго, – гэта героі станоўчыя, сапраўдныя патрыёты, дзейсныя лідары, змагары, людзі не абыякавыя да росквіту краіны, у якой яны жывуць.

Спробы крытыкаваць І. Саверчанку адносна выбару герояў кнігі малааргументаваныя. Аўтар відавочна не ставіў перад сабой мэту стварэння поўнай гістарычнай партрэтыстыкі. Мэта І. Саверчанкі-пісьменніка відавочная – гэта дэманстрацыя велічы і інтэлектуальнай моцы Беларусі на прыкладзе цікавых і моцных духам гістарычных асоб. Акрамя таго, у беларускай прасторы не існуе гістарычнай постаці, аднолькава значымай для ўсіх пакаленняў. У гэтым аспекце эсэ – плённая форма для выказвання меркаванняў, разважанняў, аргументацый з мэтай нараджэння ісціны праз аўтарскую праўду эсэіста. Героямі гісторыка-біяграфічных эсэ У. Арлова з'яўляюцца іншыя постаці беларускай гісторыі – М. Гусоўскі ("Пад знакам вечнасці", 1998 г.) і Е. Полацкая ("Нібы прамень сонечны", 1991 г.). Адметнасць эсэ як жанру – суб'ектыўнасць, якая праяўляецца не толькі ва ўнутранай арганізацыі тэксту, але і ў свабодным выбары тэмы і аб'екта мастацкага твора.

Замест філасофскіх ці парадаксальных развагаў, характэрных эсэ як жанру, І. Саверчанка прыводзіць факты, даты, апісанні падзей: "Витовт – сын князя Кейстута, родился в 1350 году. <…> Древние хроники сообщают, что он дважды, в 1368 и 1372 годах, вместе с отцом участвовал в походах на земли Московского княжества" [2, с. 42]. Даступны, лёгкі, зразумелы тэкст рэдка дапаўняецца аўтарскімі ацэнкамі кшталту "добротная, со вкусом изготовленная книжка значительных размеров" [2, с. 312], "уникальная фигура" [2, с. 312], "исключительно интересное прозаическое произведение" [2, с. 314]. У жанравых адносінах разглядаемыя творы маглі б быць, напрыклад, мастацкай біяграфіяй ці гістарычнымі нарысамі. На гэты конт трапна выказаўся Т. Адорна: "Бадай, ніколі ніводзін твор мастацтва, які валодае дастаткова высокай рэпутацыяй, не адпавядаў поўнасцю нормам свайго жанру" [1, с. 290].

Беларуская літаратура мае пэўную колькасць твораў, у якіх выражэнне я-канцэпцыі аўтара мінімальнае. Гэта культуралагічныя эсэ Л. Рублеўскай "Шыпшына для пані", філасофска-літаратурнае эсэ І. Штэйнера "Каму без чалавека патрэбна слова", гісторыка-філасофскія эсэ В. Казько "Дзікае паляванне ліхалецця" і інш.

Кожны з герояў кнігі І. Саверчанкі – інтэлектуальны лідар сваёй эпохі, магутная асоба, сапраўдны змагар за годнасць роднай краіны, волат, які



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

трымае нацыянальную ідэю. Больш за тое, аўтар указвае і на значнасць учынкаў сваіх герояў для сучаснасці, бачыць вынікі іх актыўнай дзейнасці. Напрыклад, К. Каліноўскага – у існаванні прававой краіны Беларусь, В. Ластоўскага – у захаванні нацыянальнай кніжнай традыцыі, С. Буднага – у развіцці гуманістычнага грамадства, Вітаўта Вялікага – у стварэнні магутнай і слаўнай гісторыі. Прафесійная дасведчанасць аўтара станоўча ўплывае на дынамічны характар эсэ, бо заснаваныя гэтыя творы на папярэдне распрацаваным матэрыяле (напрыклад, навуковая праца "Астафей Валовіч", выдадзеная І. Саверчанкам у 1992 годзе, грунтоўна расказвае пра нашага славутага земляка, чалавека складанага жыццёвага лёсу, асобу неардынарную, мужнага чалавека).

Спосаб прэзентацыі тэксту, стыль І. Саверчанкі даюць магутны імпульс да ўнутранага ўмоўнага дыялогу паміж аўтарам і чытачом. Так, напрыклад, кампазіцыя заключнага эсэ "Из кривичской купели", прысвечанага В. Ластоўскаму, даволі простая. Спачатку эсэіст пералічвае дасягненні гэтага дзейснага чалавека, пісьменніка, этнографа, гісторыка, кнігалюба, грамадскага дзеяча, а ў завяршэнні піша, што яго растралялі. Змест і форма ў эсэ І. Саверчанкі ўзаемазалежныя. "Бляск кароны" – кніга, якая сінтэзуе гісторыю, палітыку, літаратуру, філасофію, культуралогію і дэманструе інтэлектуальную моц Беларусі.

Творы І. Саверчанкі сцвярджаюць развіццё і функцыянаванне гістарычнага эсэ ў сучаснай беларускай літаратуры. Аб'ектам эсэ ў дадзеным прыкладзе з'яўляюцца не падзеі, а чалавек, рэальная гістарычная асоба, кіраўнік.

**Літаратура**

1. Адорно, Т. Эстетическая теория / Т. В. Адорно; пер. с нем. А. В. Дранова. – М.: Республика, 2001. – 527 с.
2. Саверченко, И. Блеск короны : Повесть-нарация, эссе / Иван Саверченко. – Минск : Мастацкая літаратура, 2014. – 326 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова